ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 6 (680) | Аўторак, 23 лютага 1988 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС

**17—18 лютага 1988 года праходзіў чарговы Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС. Пленум адкрыў Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў. На разгляд Пленума было ўнесена пытанне «Аб ходзе перабудовы сярэдняй і вышэйшай школы і задачах партыі па яе ажыццяўленню». З дакладам па гэтаму пытанню выступіў член Палітбюро, сакратар ЦК КПСС Я. К. Лігачоў.**

**З вялікай прамовай на Пленуме выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў.**

**Пленум прыняў па абмеркаванаму пытанню разгорнутую пастанову, якая апублікавана ў друку.**

**Пленум прыняў па выступленню т. Гарбачова М. С. пастанову, якая апублікавана ў друку.**

**На Пленуме разгледжаны арганізацыйныя пытанні.**

**Пленум выбраў т. Маслюкова Ю. Д. кандыдатам у члены Палітбюро ЦК КПСС.**

**Пленум выбраў сакратара ЦК КПСС т. Разумоўскага Г. П. кандыдатам у члены Палітбюро ЦК КПСС.**

**Пленум выбраў сакратаром ЦК КПСС т. Бакланава А. Д.**

**Пленум вызваліў т. Ельцына Б. М. ад абавязкаў кандыдата ў члены Палітбюро ЦК КПСС.**

**Пленум перавёў з кандыдатаў у члены ЦК КПСС тт. Болдзіна В. І. — загадчыка Агульнага аддзела ЦК КПСС, Гелерт Н. У. — механізатара саўгаса імя Амангельды, Казахская ССР, Міроненку В. І. — першага сакратара ЦК ВЛКСМ.**

**На гэтым Пленум ЦК КПСС закончыў сваю работу.**

**(ТАСС).**



**Матэрыялы Пленума ЦК КПСС, які праходзіў у Маскве 17 - 18 лютага г. г., даклад «Аб ходзе перабудовы сярэдняй і вышэйшай школы і задачах партыі па яе ажыццяўленню», з якім выступіў член Палітбюро ЦК КССС, сакратар ЦК КПСС Я. К. Лігачоў, прамова Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова знаходзяцца ў цэнтры ўвагі самых шырокіх мас.**

**НА ЗДЫМКУ: з матэрыяламі лютаўскага Пленума ЦК КПСС знаёмяцца студэнты гр. Б-32 біялагічнага факультэта В. Дашкевіч, Г. Малова, Г. Зязюліна.**

**Фота А. Ульянкінай.**

*УЗБРОЕНЫМ СІЛАМ СССР— 70 ГАДОЎ*

## НА ВАРЦЕ МІРУ І БЯСПЕКІ



Сёння спаўняецца 70 гадоў з тых незабыўных дзён лютага 1918 года, калі пачалася гераічная гісторыя Савецкіх Узброеных Сіл. Сваімі легендарнымі баявымі справамі за час свайго існавання яны даказалі бязмежную вернасць ідэям Вялікага Кастрычніка, пастаянную гатоўнасць надзейна забяспечваць бяспеку сацыялістычнай Айчыны і яе саюзнікаў.

Нараджэнне і будаўніцтва Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту непарыўна звязана з імем У. І. Леніна і дзейнасцю створанай ім Камуністычнай партыі.

Творча развіваючы асноватворныя ўстаноўкі К. Маркса і Ф. Энгельса ў прымяненні да новых гістарычных умоў, У. І. Ленін стварыў цэльнае вучэнне аб абароне сацыялістычнай Айчыны.

Адразу пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі супраць маладой рэспублікі Саветаў аб'ядналіся ўнутраная контррэвалюцыя і імперыялісты Германіі, Англіі, Францыі, ЗША і іншых дзяржаў. У надзвычай складаных і цяжкіх абставінах для першай у свеце дзяржавы рабочых і сялян паўстала пытанне аб абароне заваёў Кастрычніка, аб стварэнні арміі новага тыпу. 15 (28) студзеня 1918 года быў прыняты падпісаны У. І. Леніным Дэкрэт СНК аб стварэнні Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, які вызначыў лёс станаўлення і далейшага развіцця Узброеных Сіл Савецкай дзяржавы на шмат дзесяцігоддзяў наперад. Праз два тыдні быў прыняты Дэкрэт аб стварэнні Рабоча-Сялянскага Флоту.

Першае баявое выпрабаванне маладая Чырвоная Армія атрымала ў цяжкіх баях з кадравымі германскімі вайскамі, нанесла ім адчувальныя ўдары на подступах да Пскова, Нарвы, Гдова і Таліна. 23 лютага ў Петраградзе быў праведзены «Дзень абароны Сацыялістычнай Айчыны». У памяць аб гэтых незабыўных падзеях 23 лютага стала днём нараджэння Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту.

На абарону Айчыны партыя ўзняла ўвесь працоўны народ. Чырвоная Армія ўжо ў 1918 годзе разграміла сілы белачэхаў, Данской казацкай арміі, выгнала нямецкіх акупантаў з Украіны, Беларусі і Прыбалтыкі, а ў 1919—1920 гадах нанесла паражэнне аб'яднаным сілам Антанты і белагвардзейскім арміям Калчака, Дзянікіна, Юдзеніча, Врангеля.

Сакрушальны разгром інтэрвентаў і ўнутранай контррэвалюцыі меў велізарнае сусветна-гістарычнае значэнне. Сацыялізм выйграў першую рашаючую бітву з сіламі капіталістычнага свету.

Пачалася вялікая сацыялістычная будоўля, якая працякала ў складаных міжнародных абставінах. Імперыялізм упарта рыхтаваў новую агрэсію супраць Краіны Саветаў, не адзін раз рабіў праверку трываласці меж нашай Радзімы.

Нарастаўшая з году ў год ваенная небяспека патрабавала ад партыі і ўсяго савецкага народа пастаяннай пільнасці, умелага спалучэння мірных намаганняў з актыўным умацаваннем абароны краіны. На аснове сацыялістычнай эканомікі была створана абарончая індустрыя, якая стала базай тэхнічнага пераўзбраення Чырвонай Арміі. Да сярэдзіны 1941 года яна налічвала звыш 5 млн. чалавек і мела высокакваліфікаваныя ваенныя кадры, нягледзячы на цяжкі ўрон, нанесены іх камандным і афіцэрскаму корпусу ў другой палове 30-х гадоў культам асобы Сталіна (былі фізічна знішчаны выдатныя военачальнікі В. К. Блюхер, М. Н. Тухачэўскі, А. І. Ягораў, І. Э. Якір, І. П. Убарэвіч і інш.).

**(Заканчэнне на 2-й стар.).**

## УРУЧАНЫ ЮБІЛЕЙНЫЯ МЕДАЛІ

У мінулую сераду ў гарадскім камітэце партыі сабраліся Героі Савецкага Саюза, поўныя кавалеры ордэнаў Славы, ваенныя камісары ваенкаматаў г. Гомеля. Сюды былі запрошаны былыя воіны-інтэрнацыяналісты, подзвіг якіх пры выкананні свайго воінскага абавязку высока адзначаны Радзімай.

На сустрэчы выступіў першы сакратар гаркома КПБ У. Р. Казлоўскі. Ён расказаў пра слаўны шлях, які прайшлі за 70 гадоў свайго існавання Узброеныя Сілы СССР, а таксама аб выніках работы працоўных калектываў горада за першыя два гады XII пяцігодкі.

Ад імя Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР У. Р. Казлоўскі ўручыў прысутным юбілейныя медалі «70 гадоў Узброеных Сіл СССР». Гэтай узнагароды ўдастоены і сакратар камітэта камсамола ГДУ, былы воін-інтэрнацыяналіст, узнагароджаны медалём «За адвагу», Міхаіл Жукевіч.

## ДА 70-ГОДДЗЯ САВЕЦКАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТУ

# НА ВАРЦЕ МІРУ І БЯСПЕКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Чырвоная Армія з гонарам справілася з велізарнымі выпрабаваннямі Вялікай Айчыннай вайны. Дастаткова ўспомніць, што савецка-германскі фронт на працягу 4-х гадоў з'яўляўся галоўнай арэнай другой сусветнай вайны. На гэтым фронце фашысцкая Германія страціла 75 працэнтаў ваеннай тэхнікі і зброі.

Да пачатку 1945 года 73 працэнты асабовага саставу, артылерыі і мінамётаў, 75 працэнтаў танкаў і САУ і 65 працэнтаў самалётаў змагаліся на германскім фронце, астатнія былі сканцэнтраваны на паўднёвых і далёкаўсходніх граніцах краіны, знаходзіліся ў рэзерве галоўнакамандавання.

За ратныя подзвігі ў Вялікай Айчыннай вайне звыш 7 млн. савецкіх воінаў былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, звыш 11600 атрымалі высокае званне Героя Савецкага Саюза, з іх 115 — двойчы і больш разоў.

З 50-х гадоў, у сувязі з развязанай імперыялістычнымі дзяржавамі гонкай узбраенняў і ўзрастаннем ваеннай бяспекі, Камуністычная партыя і Савецкая дзяржава пачалі ажыццяўленне карэнных якасных пераўтварэнняў Савецкіх Узброеных Сіл, аснашчэнне іх ракетнаядзернай зброяй і іншымі навейшымі відамі зброі і ваеннай тэхнікі.

Усімі сваімі перамогамі, сённяшняй баявой магутнасцю Савецкая Армія і Ваенна-Марскі Флот абавязаны кіраўніцтву Камуністычнай партыі. Сіла Савецкіх Узброеных Сіл у іх непарыўным адзінстве з народам.

Гістарычны вопыт паказвае, што толькі намаганнямі ўсяго народа пад кіраўніцтвам партыі можна забяспечыць паспяховую абарону сацыялістычнай Радзімы. Перабудова, якая праходзіць цяпер у эканоміцы і сацыяльнай сферы, паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу, безумоўна, забяспечаць значны рост эканомікі і дабрабыту народа, павысяць абаронны патэнцыял Радзімы, яе міжнародны аўтарытэт, умацуюць мір на планеце.

Свае стваральныя планы, мірныя імкненні савецкіх людзей даводзіцца ажыццяўляць па-ранейшаму ў складанай міжнароднай абстаноўцы. «Пакуль небяспека вайны застаецца, — заявіў М. С. Гарбачоў у дакладзе «Кастрычнік і перабудова: рэвалюцыя працягваецца», — пакуль сацыяльны рэванш застаецца стрыжнем стратэгіі і мілітарысцкіх праграм Захаду, мы і ў далейшым будзем рабіць усё неабходнае для падтрымання абароннай магутнасці на ўзроўні, які выключае ваенную перавагу імперыялізму над сацыялізмам».

Савецкія Узброеныя Сілы былі і застаюцца аплотам бяспекі краін сацыялізма, аплотам міру на зямлі.

**Г. ЕЎДАКІМЕНКА,**
**старшыня Савета ветэранаў вайны і працы ГДУ, дацэнт кафедры гісторыі СССР і БССР.**

Юрий ВЛАДИМИРОВ

## ТРЕВОЖНОЕ ВРЕМЯ

Тревожное время минувшей войны
Шинель надевало на плечи страны,
Вручало винтовку, стремило вперед:
За древнюю землю, за мирный народ,

И правду писало солдатским штыком —
С ней каждый на фронте был лично знаком,
И будни армейские потом изведал,
И влаги болотной в достатке испил,

И каши траншейной досыта отведал,
Дороги в Европу костьми проторил.
Пропитаны кровью холмы Подмосковья,
Краснеют прожилы у крымских камней,
Зеелов, Калач, — все оплачено кровью,
От брестских развалин до радостных дней.

А горечь измен, поражений, доселе —
Рубцом заржавевшим на коже лежит,
Победная радость — в натруженном теле,
В крови растворившись по жилам бежит.

Хлебнул за Россию солдат испытаний,
А каждый живущий пусть будет знаком,
Как слово «Победа» на вражеских зданьях
Писалось советским, солдатским штыком!

*НЕЗАБЫЎНАЕ*

# ВЫСТАЯЛІ І ПЕРАМАГЛІ

Для кожнага савецкага чалавека горад Леніна — гэта наша гісторыя, наша гордасць і слава. З асаблівым пачуццём адносімся мы, усе тыя, хто 900 блакадных дзён і начэй абаранялі Ленінград у гады Вялікай Айчыннай вайны, да гэтага горада. Шмат гадоў прайшло з таго часу, а памяць добра захавала падзеі тых дзён.

Святкуючы 70-годдзе нашых Узброеных Сіл, мне зноў і зноў прыходзяць на памяць дні ленінградскай блакады: студзень 1943 г.— яе прарыў каля Ладажскага возера, студзень 1944 г. — канчатковы разгром ворага каля сцен горада Леніна.

14 студзеня 1944 г. пачалося тое, у што верылі, чаго чакалі, да чаго рыхтаваліся воіны Савецкай Арміі —вызваленне і адплата. У гэты дзень войскі Прыморскага плацдарма перайшлі ў наступленне. А мы, артылерысты, вялі метадычны агонь па ўмацаваннях ворага ў раёне Пулкаўскіх вышынь.

На другі дзень быў нанесены яшчэ мацнейшы ўдар па праціўніку. Артпадрыхтоўка працягвалася больш гадзіны. Гэтую кананаду слухалі ленінградцы — спачатку насцярожана, затым — з радасцю.

Абарона праціўніка была вельмі моцнай, нездарма ён удасканальваў яе на працягу 27 месяцаў. Спачатку мы праходзілі ў суткі ўсяго па некалькі кіламетраў. Нашы артылерысты, разбураючы абарончыя збудаванні і апорныя пункты ворага, забяспечвалі рух танкаў і пяхоты. Праз тыдзень абедзве нашы групоўкі войск (на Прыморскім плацдарме і каля Пулкаўскіх вышынь) злучыліся ў раёне населенага пункта Ропша. Пачалося непераадступнае праследаванне праціўніка па ўсіх напрамках — на Лугу, Пскоў, Кінгісеп, Нарву.

Увайшоў у гісторыю дзень 27 студзеня 1944 года, калі Ленінград быў поўнасцю вызвален ад варожай блакады. Вечарам прагрымеў салют— 24 залпы з 324 гармат, які трансліраваўся па радыё на ўсю краіну. Як расказвалі відавочцы, многія плакалі, не саромеючыся сваіх слёз. Пачуцці ленінградцаў добра перадаў паэт Юрый Воранаў у сваім вершы «27 января 1944 г.», дзяцінства якога прыйшлося на цяжкія блакадныя гады:

**За залпом залп,**
**Гремит салют,**
**Ракеты в воздухе горячем**
**Цветами пестрыми цветут,**
**А ленинградцы тихо плачут.**

**Ни успокаивать пока,**
**Ни утешать людей не надо,**
**Их радость слишком велика —**
**Гремит салют над Ленинградом...**

Абарона і вызваленне горада Леніна — гэта толькі адна старонка гераічнага летапісу ў гісторыі Савецкіх Узброеных Сіл. А колькі было іх на іншых франтах Вялікай Айчыннай вайны! І сёння, у дзень 70-годдзя Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту, наш народ аддае даніну павагі ўсім тым, хто ў грозныя гады адстаяў свабоду і незалежнасць першай у свеце Краіны Саветаў.

**Г. МІЛЬЧАНКА,**
**удзельнік баёў за г. Ленінград, падпалкоўнік у адстаўцы.**

# ВЫСТУПІЎ ГЕРОЙ

Многія сотні кніг, кінафільмаў, тэле- і радыёперадач даносяць да нас самыя разнастайныя звесткі аб слаўным шляху Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Але, відаць, нічым нельга замяніць той каштоўнасці, якую прыносяць асабістыя сустрэчы моладзі з былымі воінамі і партызанамі, удзельнікамі падполля, якіх мы цяпер з павагай называем ветэранамі. І даўно стала добрай традыцыяй запрашаць іх да сябе ў госці ў дні месячнікаў, прысвечаных чарговай гадавіне нараджэння Узброеных Сіл СССР.

Надоўга стануць памятнымі для студэнтаў нашага універсітэта сустрэчы з ветэранамі вайны, прысвечаныя 70-годдзю Узброеных Сіл СССР. Яны адбыліся на ўсіх факультэтах. Перад студэнтамі выступілі з успамінамі былыя франтавікі і партызаны, якія працягваюць працаваць у калектыве універсітэта, а таксама многія гамяльчане, чые імёны добра вядомы жыхарам нашага горада.

Амаль штогод бывае жаданым госцем у студэнтаў нашага універсітэта Герой Савецкага Саюза палкоўнік у адстаўцы П. С. Стракалаў. На гэты раз яго цёпла прымалі на матэматычным факультэце. Студэнты з вялікай цікавасцю слухалі расказ Героя аб суровых падзеях ваенных дзён, аб беспрыкладнай мужнасці і гераізме воінаў, усяго савецкага народа, прадэманстраваных у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

*Маршруты агітбрыгады*

# ПЕРАД ШКОЛЬНІКАМІ І ВОІНАМІ

**У рамках Усесаюзнага месячніка абаронна-масавай работы, які сёлета прысвячаўся слаўнаму юбілею Савецкіх Узброеных Сіл — 70-годдзю з дня іх утварэння, з канцэртамі мастацкай самадзейнасці ў населеныя пункты Гомельшчыны выязджалі ў час зімовых канікулаў студэнцкія агітбрыгады універсітэта.**

Маршрут самадзейных артыстаў біялагічнага факультэта пралёг у г. п. Брагін. У першы дзень студэнты паказалі сваю канцэртную праграму ў раённым Доме культуры, дзе сабралася звыш 250 вучняў сярэдняй школы. Рабяты ўбачылі цыганскі танец у выкананні В. Саўкінай і жартоўны —украінскі. «Замалёўкі» — так назвалі яго самі выканаўцы А. Навумчык і С. Чубукоў. Былі паказаны таксама сцэнкі са студэнцкага жыцця. Гучалі песні А. Разенбаўма ў выкананні С. Старыненкі, А. Валодзіна і С. Болсун спявалі народныя песні. Вясёлы настрой панаваў у зале ў час паказу студэнтамі пародый на прыродаахоўныя тэмы.

На наступны дзень студэнцкую агітбрыгаду цёпла прымалі ў васьмігадовай школе раённага цэнтра. З-за адсутнасці ў ёй актавай залы студэнтам давялося выступаць у спартыўнай. Паставілі побач лавачкі — у некалькіх метрах ад «сцэны». У кутку перагарадзілі «касцюмерную». Але ўсе гэтыя нязручнасці не перашкодзілі самадзейным артыстам заваяваць сімпатыі юных гледачоў. А лепшай узнагародай для студэнтаў была сумесна выкананая імі са школьнікамі і настаўнікамі песня пра кракадзіла Гену.

Брагінскі РК ЛКСМБ узнагародзіў студэнцкую агітбрыгаду біялагічнага факультэта граматай.

Цёпла прымалі таксама гасцей і воіны Гомельскага гарнізона. С. Водчыц паказаў ім слайды аб студэнцкім будаўнічым атрадзе, пейзажы, якія вельмі спадабаліся салдатам. А на развітанне Р. Пянько сыграла на баяне «Развітанне славянкі», што не магло не прывесці ў захапленне гледачоў.

Выступленне агітбрыгады «увекавечыў» сваім фотаапаратам П. Макарэвіч.

Усе ўдзельнікі агітбрыгады засталіся задаволенымі тым, што прынеслі шмат прыемных мінут сваім гледачам. З добрым настроем яны вярнуліся ў Гомель.

**На здымках:** агітбрыгада біяфака ГДУ ў гасцях у воінаў.

Фота **П. Макарэвіча.**





